# «АПОВЕСЦЬ БУДУЧЫХ ДЗЁН» ЯНКІ МАЎРА ЯК ДЗІЦЯЧАЯ ЎТОПІЯ

**М. В. Шамякіна**

*Кандыдат філалагічных навук,*
*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,*
*вул. Сурганава, 1, корп 2, 220072, г. Мінск, Беларусь, centre@belcentre.by*

Разглядаецца амаль не даследаваны твор Янкі Маўра «Аповесць будучых дзён» на фоне дзіцячай фантастычнай літаратуры савецкага часу. Асаблівая ўвага засяроджана на станоўчым вобразе будучыні, прадэманстраваным у «Аповесці…», што дае падставу называць яе дзіцячай утопіяй.

***Ключавыя словы:*** беларуская савецкая фантастыка; утопія; дзіцячая літаратура; дзіцячая ўтопія; вобраз будучыні; Янка Маўр.

# «АПОВЕСЦЬ БУДУЧЫХ ДЗЁН» ЯНКИ МАВРА КАК ДЕТСКАЯ УТОПИЯ

**М. В. Шамякина**

*Кандидат филологических наук,*
*Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси,*
*ул. Сурганова, 1, корп 2, 220072, г. Минск, Беларусь, centre@belcentre.by*

Рассматривается почти не исследованное произведение Янки Мавра «Аповесць будучых дзён» на фоне детской фантастической литературы советского времени. Особое внимание сосредаточено на положительном образе будущего, продемонстрированном в «Аповесці…», что дает повод называть ее детской утопией.

***Ключевые слова:*** белорусская советская фантастика; утопия; детская литература; детская утопия; образ будущего; Янка Мавр.

# «THE TALE OF FUTURE DAYS» BY YANKEE MOOR AS A CHILD’S UTOPIA

**M. V. Shamyakina**

*PhD,*
*Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature*
*of the National Academy of Sciences of Belarus,*
*1 Surganova Street, building 2, 220072, Minsk, Belarus, centre@belcentre.by*

The article examines the practically unexplored work of Yankee Moor «The Tale of Future Days» against the background of children's fantasy literature of the Soviet era. Special attention is focused on the positive image of the future shown in the «Tale of Future Days», which gives reason to call it a childish utopia.

***Keywords:*** Belarusian Soviet fiction; utopia; children's literature; children's utopia; image of the future; Yanka Mavr.

Расійскі даследчык літаратуры Арцём Краўчанка адзначае, што «у савецкага грамадства і ўлады ад пачатку прысутнічаў моцны запыт на фарміраванне ўтапічнай карціны будучыні; сама ідэя існавання савецкай дзяржавы была моцна звязана з імкненнем рэалізаваць глабальны праект такога роду. Узнікла спецыфічная сітуацыя, калі пісьменнік, які стварае ўтопію, мог выступаць не толькі і не столькі як выражальнік уласнай канцэпцыі бачання будучыні, а як фактычны інтэрпрэтатар дзяржаўнай дактрыны развіцця» [1].

Пры гэтым і пісьменнікі і грамадства ўсведамлялі, што менавіта дзецям належыць будаваць камуністычную будучыню і жыць у ёй, таму іх неабходна рыхтаваць да вырашэння адпаведных задач. І вельмі важнай часткай падрыхтоўкі мыслілася стварэнне зразумелага дзецям пажаданага і прывабнага вобраза заўтрашняга дня.

Найбольш прыдатнай для стварэння вобраза будучыні ў дзяцей і падлеткаў стала фантастычная літаратура. З аднаго боку, навуковая фантастыка па сутнасці сваёй так ці інакш скіравана ў будучыню. Нават калі дзеянне адбываецца ў час напісання твора, у цэнтры аповеду знаходзіцца вынаходніцтва, якога ў рэальнасці пакуль няма. З другога боку, традыцыйна фантастычная літаратура з яе рамантычным пафасам найбольш прываблівае падлеткаў і моладзь.

У беларускай літаратуры першым, хто разгледзеў і выкарыстаў, у тым ліку і педагагічны патэнцыял фантастыкі, быў Янка Маўр. Ён напісаў некалькі фантастычных твораў: апавяданне «Піянерскія казкі» (1927), аповесці «Чалавек ідзе» (1926), «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага» (1954–1955) і інш. Але асаблівую цікавасць у плане вывучэння вобраза будучыні ўяўляе «Аповесць будучых дзён» [2]. Пісалася яна ў 1930 г., асобнай кнігай выйшла ў 1932 г., а дзеянне ў ёй адбываецца недзе ў 1940–1941 гг., такім чынам, гэта так званая «фантастыка бліжэйшага прыцэлу».

У цэнтры твора 14-гадовы хлопчык Юзік, які з Заходняй Беларусі, што знаходзіцца пад уладай панскай Польшчы, трапляе ў Савецкую Беларусь і знаёміцца з яе жыццём. Ёсць некалькі персанажаў, праз якіх тое знаёмства адбываецца. Спачатку яго ўводзіць у курс спраў таварыш Шторм – майстар на харчовым камбінаце, дзе Юзік некалькі тыдняў працуе (яго змясцілі пры вытворчасці, бо там давалася жытло і харчаванне). А пасля герой едзе да дзеда ў калгас, і тут пра жыццё Савецкай Беларусі яму апавядае ўласна дзядуля, а таксама стрыечныя сёстры і браты.

Як бачна, «Аповесць будучых дзён» будуецца ў адпаведнасці з класічнай формай утопій, калі госць са «знешняга свету» трапляе ў цудоўную краіну, падрабязнасці ладу і звычак якой, як правіла, тлумачыць яму праважаты – мясцовы жыхар.

Такая форма ідзе непасрэдна ад «Утопіі» (1516) Томаса Мора і паўтараецца ў цэлым шэрагу пазнейшых твораў. Часта гэтае клішэ – мясцовы жыхар водзіць госця па ўтапічнай краіне – фактычна замяняе сабой сюжэт у традыцыйным разуменні. Так будуюцца і «Падарожжы Гулівера» (1726) Джанатана Свіфта, і «Новая Атлантыда» (1627) Фрэнсіса Бэкана – класічныя ў гэтым жанры творы. У XIX ст. аналагічна пабудавана ўтопія выдатнага мастака мадэрна Уільяма Морыса «Навіны з Ніадкуль» (1890).

Пазней, у XX ст., падобная структура захоўваецца і сустракаецца нярэдка – цалкам ці часткова. Цалкам замяняе сюжэт у «Сучаснай ўтопіі» (1905) Герберта Уэлса, «Падарожжа брата майго Аляксея ў краіну сялянскай утопіі» (1920) А. Чаянава, «Чырвонай зорцы» (1908) А. Багданава, «Востраве» (1962) Олдаса Хакслі. Прысутнічае таксама ў выглядзе экскурсіі ў Олдаса Хакслі ў «Чароўным новым свеце» (1932).

Утопія зусім не абавязкова знаходзіцца ў будучыні, бо першыя ўтопіі (скажам, Т. Мора) паказваюць Утопію як прасторава аддаленае месца. Менавіта такому разуменню адпавядае «Аповесць будучых дзён». Галоўны герой не пераносіцца ў будучыню. Я. Маўр знаходзіць іншы ход для стварэння кантрасту: не паміж сучаснасцю і будучыняй, а паміж рознымі сацыяльнымі ўкладамі ў суседніх краінах.

Даследчык жанра ўтопіі Ф. Аінса вызначаў некалькі адметных рыс утопіі. Сярод іх урбанізм, прасторавая ізаляванасць, аўтаркія, пазачасавасць, рэгламентацыя жыцця [3].

На фоне ўтопіі разгортваецца дзеянне шмат якіх савецкіх дзіцячых твораў. Аднак не ўсе з іх маюць структуру класічнай утопіі: калі ў галоўнага героя ёсць праважаты, які знаёміць яго з мясцовымі дзівосамі. Нярэдка бывае так, што дзеянне ўсяго твора разгортваецца ў будучыні. Напрыклад, «Я іду сустракаць брата» (1962) Уладзіслава Крапівіна і «Апошняя арбіта» нашага беларуса Уладзіміра Шыціка (1962), пачатак цыклу Кіра Булычова пра Алісу Селязнёву («Дзяўчынка, з якой нічога не здарыцца» – 1965), «Пяцёра ў звяздалёце» (1975) Анатоля Машкоўскага, «Мільён і адзін дзень канікул» (1979) Яўгена Вялцістава.

Каля 1960-х гадоў складваецца нават спецыфічны канон будучыні: камунізм як пануючы сацыяльны лад, дабрабыт, надзвычай развітая навука, касмічныя падарожжы.

Сустракаюцца і творы, напрыклад, у таго ж Яўгена Вялцістава, якія ад канону трохі адхіляюцца: у іх касмічных падарожжаў няма. Ёсць сацыялізм, урбанізм, навука і тэхналогіі. Кнігі яго вядомыя: «Электронік – хлопчык з валізы» (1964), «Рэссі – няўлоўны сябра» (1970) і «Новыя прыгоды Электроніка» (1984).

Але ствараліся дзіцячыя творы, амаль цалкам пабудаваныя па фармальнай мадэлі класічных утопій, дзе адзін ці некалькі падарожнікаў трапляюць у дзівосную краіну, сустракаюць нейкага праважатага (таксама аднаго ці некалькіх), які і знаёміць іх з мясцовым ладам жыцця.

У 1924 г. выходзіць адзін з першых падобных твораў: аповесць Інакенція Жукава «Падарожжа звяна «Чырвонай зоркі» ў краіну цудаў». Другое Лысагорскае звяно піянераў-ленінцаў, якое называецца як папулярны ў той час утапічны раман Аляксандра Багданава, і іх сабака Шарык пераносяцца ў 1957 год, стаўшы на пляму святла, якую нечакана знайшлі ў лесе падчас паходу. Па дарозе сустракаюць піянерскае звяно з будучыні – «Вечны касцёр». Імёны іх – люстраны адбітак імёнаў галоўных герояў. А ў рэшце рэшт, аказваецца, што падарожжа адбылося ў сне камандзіра звяна Сярожы. Тут праважатымі чакана робяцца піянеры з будучыні.

Варта адзначыць, што ў аповесці Жукава аповед засяроджаны на сацыяльна-палітычным баку будучыі: на перамозе ва ўсім свеце камунізму, а тэхналагічныя дасягненні застаюцца па-за ўвагай аўтара.

У сваю чаргу, у 1957 г. (у годзе, куды падарожнічалі піянеры з папярэдняга твора) выходзіць аповесць Віталія Міленцьева «33 сакавіка». 13-гадовы школьнік

Вася зімой ідзе шукаць мамантавы зуб, праз яміну ў снезе трапляе ў будучыню – у 2005 год. А праважатым робіцца яго пастарэлы сябра. Аднак і гэтае падарожжа апынулася сном.

У творы Міленцьева на першы план выходзяць тэхнічныя вынаходніцтва будучыні, у першую чаргу – аўтамабілі.

1963 г. Аляксандр Светаў выпускае аповесць «Ветачкіны падарожнічаюць у будучыню». У аповесці дзеці пераносяцца ў будучыню з дапамогай чараўніка, які дае ім чароўны эліксір. Такім чынам, тут навуковая фантастыка змешваецца з казкай.

Аналагічная сітуацыя ў творы Віталя Губарава «Падарожжа на Ранішнюю Зорку» (1961), дзе чараўнік пераносіць герояў на іншыя планеты. Але там, акрамя таго, прысутнічаюць тры багатыры, нейкія персанажы рускіх народных казак; у цэлым вельмі эклектычны, нават хаатычны сюжэтна твор. А гэта той самы аўтар, па іншай аповесці якога знялі нядрэнны фільм «Каралеўства крывых люстэркаў» (кніга выйшла ў 1951 г.).

Дарэчы, Янка Маўр у невялікім апавяданні «Піянерскія казкі», якое выйшла ў часопісе «Беларускі піянер» у 1927 г., прадэманстраваў мяжу паміж казкай і навуковай фантастыкай.

У навукова-фантастычным ключы, без чараўніцтва, адбываюцца падарожжы ў цэлым шэрагу твораў (праз ужыванне тэхнічных прыладаў ці з прычыны невядомых фізічных законаў і парадоксаў).

У 1978 г. выходзіць «100 гадоў таму наперад» Кіра Булычова. У 1982 г. на старонках «Уральского следопыта» з'яўляецца аповесць Сямёна Сляпыніна «Хлопчык з саваны». Тут хлопчык з каменнага веку трапляе ў будучыню. У абодвух выпадках – з дапамогай машыны часу.

Нарэшце, у тым жа 1982 г. на старонках таго ж «Уральского следопыта» пачынае выходзіць трылогія Уладзіслава Крапівіна «Свята лета ў Старагорску» (аповесць першая «Галубятня на жоўтай паляне»). Тут касманаўт пераносіцца ў паралельную рэальнасць, у горад, які нагадвае горад яго дзяцінства, але ўтапічны, ідэалізаваны. У дадзеным выпадку перанос адбываецца праз нейкі фізічны парадокс. Наогул у многіх аповесцях У. Крапівіна героі пераносяцца ў паралельныя сусветы.

Усе названыя творы дэманструюць рысы, уласцівыя ўтопіям: урбанізм, наяўнасць фантастычных тэхналогій, своеасаблівую сацыяльную будову. Хоць чым пазней напісаны твор, тым менш у ім такога ідэалагічнага падмурку і больш – дзеяння, арыгінальнай светабудовы і каларытных характараў.

Аднак і матыў госця ў невядомым свеце, дзе яму патрэбны праважаты, часам захоўваецца. У ролі такіх гасцей аказваюцца дарослыя героі У. Крапівіна (Яраслаў і Глеб). А ў Булычова падарожнічае Аліса і Коля.

Варта адзначыць, што ў «Аповесці будучых дзён» вельмі ўдала абыграны гэты ўласцівы ўтопіям падыход да пабудовы сюжэту з госцем і праважатымі. Ён сюжэт не замяняе, а ўпісваецца ў яго, прычым прысутнічае толькі ў другой частцы твора.

Першая частка прысвечана апісанню жыцця Юзіка, яго сям'і і сяброў у Заходняй Беларусі і нагадвае шматлікія тагачасныя творы пра прыгнёт сялян у дакастрычніцкі перыяд. Але ўзгадваюцца і тэхналогіі (на ўзроўні пачатку ХХ ст.), і малаадукаванасць простых людзей, і іншыя акалічнасці, якія пазней спрацуюць на кантраст. Пры-

сутнічае тэма падпольнай барацьбы і нават шпіёнская гісторыя. Дзеянне разгортваецца імкліва, героі жывыя, індывідуалізаваныя, кожны са сваім характарам і светапоглядам.

Па-іншаму выглядае другая частка, дзе апісваецца знаёмства Юзіка з жыццём Савецкай Беларусі. Герой падарожнічае ў прасторы, але ўзнікае адчуванне, што ён перанёсся ў будучыню гадоў на 30.

Тут шмат апісанняў тэхнічных навінак: ад амаль цалкам аўтаматызаванай фабрыкі-кухні і незвычайных сельскагаспадарчых прылад да педагагічных тэхналогій, якія і сёння выглядаюць абсалютна адэкватна: магчымасць атрымліваць і падвышаць адукацыю для дарослых і пажылых, сістэма завочнага, дыстанцыйнага навучання, нават он-лайн лекцыя.

Адзіны мінус: вобразы савецкіх людзей выглядаюць больш схематычнымі, чым польскія сябры Юзіка. Адчуваецца, што яны – найперш функцыя, тыя самыя ўтапічныя праважатыя, якія знаёмяць галоўнага героя са светам будучыні.

Гэта зразумела, бо само пытанне аб тым, якім павінен быць чалавек будучыні, у творах навуковай фантастыкі было пастаўлена пазней. Скажам, у кнігах карыфея жанра Івана Яфрэмава («Туманнасць Андрамеды» – 1957), прычым вырашана ў яго не вельмі паспяхова, бо яфрэмаўскія людзі будучыні, мягка кажучы, не прывабныя як асобы. Ці ў творах Сяргея Снегава («Людзі як багі» 1966), які стварыў сапраўдных супергерояў не горш за персанажаў Марвел.

Такім чынам, Янка Маўр у «Аповесці будучых дзён» дэманструе характэрную для савецкай утопіі карціну будучыні і ў многім выкарыстоўвае тыповую для ўтопій пабудову сюжэта. Аднак робіць гэта няяўна, разбавіўшы ўтапічны дыдактызм і аднастайныя карціны знаёмства з дзівосамі даволі захапляльнымі сюжэтнымі хадамі.

Вобраз будучыні, які вымалёўваецца ў яго творы, таксама мае рысы ўтопіі. Вялікая частка дзеяння разгортваецца ў горадзе. Шмат тэхнічных падрабязнасцей, сацыяльна-эканамічных ідэй. Але галоўнае: Маўр падступаецца да ідэі *выхавання* чалавека будучыні. Хаця жывыя вобразы ў яго пакуль не атрымаліся, але ён паказаў, якім чынам выхоўваецца новы чалавек для новага грамадства: праз адукацыю і пастаяннае самаўдасканаленне.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Кравченко Артем*. Гости в будущее: «пионерская утопия» и советская действительность [Электронный ресурс] // Философско-литературный журнал «Логос». 2017. №5 (120). URL: https://cyberleninka.ru/article/n/gosti-v-buduschee-pionerskaya-utopiya-i-sovetskaya-deystvitelnost (дата обращения: 14.10.2024).

2. *Маўр Я.* Аповесць будучых дзён // Юндзетсэктар. Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1932.

3. *Аинса Ф.* Реконструкция утопии. Москва : Наследие – Editions UNESCO, 1999.